View metadata, citation and similar papers at core.ac.uk brought to you by CORE

УДК 39(=161):115

# АСЭНСАВАННЯ ЛІНЕЙНАГА ЧАСУ Ў МІФАПАЭТЫЧНАЙ СПАДЧЫНЕ І АБРАДАВАЙ ПРАКТЫЦЫ ЎСХОДНЕСЛАВЯНСКІХ НАРОДАЎ

***Аксана Катовіч***
*Мінск, Беларусь*

У артыкуле разглядаецца лінейны вектар разгортвання часу (0 – 3 – 9 – 40 – 1 год), які стаў адным з галоўных структураўтваральных фактараў у сямейна-родавых абрадах і паэтыцы фальклорных жанраў. Структура лінейнага вектару часу непасрэдным чынам звязана з цыклічнасцю Месяца і Сонца і святкаваннем хрысціянскай Пасхаліі.

***Ключавыя словы: час і прастора, лінейны час, абрадавы час, каляндарны час, цыклічны час, канвенгерцыя часу, рытм, забарона, рэгламентацыя, рытуальна-абрадавы комплекс***

Адной з фундаментальных праблем культуралагічнага аналізу міфапаэтычнай спадчыны ўсходнеславянскіх народаў з'яўляецца асэнсаванне канцэпту часу. У філасофскіх тэарэтыка-метадалагічных даследаваннях склалася тэндэнцыя разглядаць катэгорыю часу ў непасрэднай сувязі з катэгорыяй прасторы, што дало падставы М.М. Бахціну ўвесці ў навуковы зварот тэрмін хранатоп. Разам з тым навуковы аналіз дапускае магчымасць своеасаблівага “анатаміравання” прадмета даследавання дзеля больш дэталёвага разгляду адной складовай. Асаблівай увагі заслугоўвае праблема дыхатаміі часу ў розных каляндарных сістэмах; дыскрэтнасць абрадавага часу ў межах міжродавай камунікацыі; канвергенцыя часу ў прасторы жыццядзейнасці традыцыйнага вясковага

Полесгу

соцыума; дыхатамія сакральнага і будзённага часу ў жыццядзейнасці мужчынскіх і жаночых саюзаў абракальнага характару.

Агульнавядомай аксіёмай з'яўляецца факт, што рытмічнасць земляробчых работ і цыклічнасць каляндарнага часу ў традыцыйным грамадстве задаюць Сонца і Месяц. Аднак да нашых дзён практычна зусім недаследаванай застаецца праблема часавай універсаліі, якая цэнтруе вакол сябе рытуальна-абрадавыя комплексы сямейна-родавай накіраванасці. Надзвычай важнае значэнне мае даследаванне маркёраў часу ў структуры рытму 0 – 3 – 9 – 40 – 1год, які ў грамадскай свядомасці часцей асацыіруецца з пахавальна-памінальнымі абрадамі. Аналіз першакрыніц, даследаванняў фалькларыстаў, этнографаў XIX-XX ст., уласных экспедыцыйных запісаў дазваляе зрабіць выснову: гэты рытм мае ўніверсальны або матрычны характар, таму што структурыруе не толькі пахавальна-памінальны цыкл абрадаў, але і не менш складаныя па архітэктоніцы рытуальна-абрадавыя комплексы вяселля і радзінна-хрэсьбіннай абраднасці [13, с. 144–149].

Адзін з фактараў матрыцы гэтага рытму пераканаўча гаворыць аб тым, што паміж каляндарнымі і сямейна-родавымі абрадавымі структурамі існуе глыбінная сувязь [29, с. 42–43]. Святы прыродна-земляробчага календара ахопліваюць закальцаваны адрэзак часу, працягласць якога доўжыцца салярны год. Невыпадкова лінейны час сямейна-родавых абрадаў таксама доўжыцца год. Калі ж мы канстатуем супадзенне матрычных характарыстык, то міжволі павінны прыйсці да высновы аб адзінстве міфапаэтычных вытокаў гэтай этнакультурнай з'явы.

Універсум лінейнага часу праяўляе сябе на ўзроўні архетыпаў у розных жанрах беларускага фальклору, перш за ўсё ў казачным эпасе. У шэрагу чарадзейных казак сустракаецца наступная стэрэатыпізаваная формула-зачын: "*У некаторым царстве, у некаторым государстве…*" [33, с. 115]; "*У яком-тось краю жылі людзі бы ў раю: гаравалі, працавалі дай беды не малі…*" [22, с. 156]. У дадзеным выпадку казачнікі і іншыя інфарматары выкарыстоўваюць ужо дэсакралізаваную ініцыяльную формулу. Там жа, дзе паэтыка казкі захавала архаічную сувязь з міфа-рытуальнай практыкай, топіка сакральнай геаграфіі акрэслена больш дакладна: "*У тры-дзевятым царстве, у тры-дзесятым государств…*" [33, с. 427, 383]. Распачынаць казачны твор, які мог быць успрынята аўдыторыяй з недаверам, трэба было выкананнем своеасаблівага акта "пераключэння" свядомасці з будзённа-побытавага на фантастычна-сакралізаваны гарызонт успрыняцця рэчаіснасці. Пры дапамозе сакралізаванай формулы, ў якой закладзены разглядаемы лікавы код, казачнік здзяйсняў сімвалічны акт часавага і прасторавага перамяшчэння слухачоў. Напрыканцы разгортваемых сюжэтных падзей казачнік абавязкова выкарыстае формулу адваротнага пераключэння слухачоў з мэтай іх вяртання ў кантэкст рэчаіснасці.

Сюжэты чарадзейных казак, у якіх герой адпраўляецца на пошукі сваёй нявесты, распавядаюць пра шматлікія выпрабаванні, якія яму даводзіцца пераадолець. Канву гэтых падзей акрэсліваюць ужо знаёмыя лікавыя маркёры, якія дакладна паўтараюць **лінейны вектар абрадавага часу**. Калі казачны герой сустракаецца са Змеем Гарынычам на мяжы меднага царства, то ў таго аказваецца **тры** галавы. Адразу ж напрошваецца аналогія з абрадавай структурай універсальнага рытму, які спыняе гадзіннік каляндарных святкаванняў і распачынае цыкл пахавальна-памінальных рытуалаў. Маецца на ўвазе **першы памінальны стол**, які часцей за ўсё ладзілі **на трэці дзень пасля смерці чалавека.** Калі ж яны сутыкаюцца на мяжы срэбранага царства, то ў Змея аказваецца ўжо **дзевяць** галоў: **другі памінальны стол** накрываюць **на дзевяты дзень пасля смерці** чалавека ("дзевяціны"). Апошняя сустрэча Змея Гарыныча і Івана Царэвіча адбываецца ўжо на мяжы залатога царства, пачвара-праціўнік на гэты раз мае **дванаццаць** галоў [20, с. 264; 32, с. 29, 37]. Безумоўна, перамога над Цудам-Юдам сімвалізавала не што іншае, як завяршэнне вектара памінальнага часу працягласцю ў год. Гэтаму часу адпавядаў яшчэ адзін **памінальны стол,** які рабілі **роўна праз год** = дванаццаць месяцаў пасля смерці родзіча **– "угодкі"** [19, с. 223; 23, с. 232; 27, с. 162].



Полесгу

Аднак у казках сустракаюцца такія прыклады, калі ў Змея Гарыныча аказваецца шэсць галоў. Гэты кодавы маркёр адпавядае лакальным варыянтам правядзення памінак. У некаторых месцах Беларусі памінальны стол робяць праз паўгода, г. зн. праз шэсць месяцаў; а згодна каталіцкай традыцыі імшу па памёршаму спраўляюць якраз на шосты і трыццаты ("тры-дзесятае царства") дзень [13, с. 147-148].

Пасля завяршэння ўсіх выпрабаванняў, а гэта магло быць падчас абрадаў ініцыяцыі, як заўважыў У.Я. Проп, або пасля заканчэння тэрміну абмежаванняў, звязаных з годам жалобы, моладзь перадшлюбнага ўзросту атрымлівала права справіць вяселле: *"І справілі яны велькае вяселле і жылі добра…"* [32, с. 39, 156]. У.Я. Проп сцвярджае: "Ужо здаўна заўважана, што казка мае нейкую сувязь з вобласцю культаў, з рэлігіяй... Сувязь казкі з рэлігіяй можа быць выдзелена ў асобнае пытанне, якое выцякае з сувязі казкі з сацыяльным інстытутам... Казка захавала сляды вельмі многіх абрадаў і звычаяў: многія матывы толькі цераз супастаўленне з абрадамі атрымліваюць сваё генетычнае тлумачэнне... Самы просты выпадак – гэта поўнае супадзенне абраду і звычаю з казкай" [20, с. 12].

Пахавальнаму абраду быў нададзены самы высокі культурны статус у сферы жыццядзейнасці традыцыйнага грамадства. Толькі гэты абрад (а дакладней, падзея, якую ён суправаджае) у стане адмяніць або адціснуць на другі план любы з усіх рытуальна-абрадавых комплексаў як народнай, так і хрысціянскай культуры [11, с. 458-459].

Кожны з памінальных сталоў, дакладней дзень, калі яго рабілі, быў абумоўлены архаічнымі ўяўленнямі нашых продкаў, а затым і хрысціянскімі, аб стане душы памёршага, яе іспытах па шляху на Нябёсы, у іншы свет, тое *тры-дзевятае царства, тры-дзесятае гасударства*. **У дзень смерці або да трох дзён** душа развітваецца з целам, **на дзевяты дзень** яна пакідае хату, зямлю; на **саракавы** – прадстае перад Творцам, адбываецца так званы Судны дзень. На Піншчыне лічылі, што менавіта шэсць тыдняў душа нябожчыка знаходзіцца ў хаце [5, с. 187]. Праз адзін год душа знаходзіць вечны спакой [9, с. 291-292; 10, с. 94-121; 25, с. 162-167; 27, с. 85; 28, с. 48-50; 34, с. 181-184]. Каб бачыць, што адбываецца з душой памёршага, прадбачлівыя беларусы абавязкова "хутчэй на вокны ставяць чаркі або шклянкі з чыстаю вадою, каб душы было ў чом пакупацца да памыцца, пакуль стане на суд перад Богам" [23, с. 230]; "нанач ставяць ваду, палаценца кладуць на гроб, вязуць на кладбішча, а палатно забіраюць і ложаць на кут. На гэта палаценца ставяць стакан вады. І так да 40 дзён" [16, с. 243].

Структура вектара і сэнс падзей, звязаных з паслясмяротным існаваннем душы, дазваляе зразумець змест абрадавых формул, якія суправаджаюць памінальныя сталы. Да саракавога дня пасля смерці павінна гучаць формула-пажаданне для памёршых і формула-абярэг для жывых: *"Зямля яму пухам"* [30, с. 348], *"Каб яму зямля пяром (пушынкай)",* а пасля саракавога іншая сакралізаваная формула: *"Царства нябеснае"; "Светласць векавечная няхай яму свеціць!"* [6, с. 180-181]. Гэтым рытуальным актам выказвалася павага да таго, хто толькі што адправіўся ў беззваротнае падарожжа ў вечнасць, і рабілася пэўная дыстанцыя з гэтым царствам.

Смерць чалавека стварала выключную сітуацыю, у кантэксце якой Род нябожчыка ў самым шырокім разуменні гэтага слова пасля пахавання будзе жыць па звычайнаму календару, а самыя блізкія родныя (уключаючы першую і другую ступень сваяцтва, г.зн. сям'ю памёршага) аказваліся ў жыццёвым "безвременьи" [8, с. 27] або "зазеркальи". Нездарма ж ў першыя хвіліны пасля смерці чалавека прадметы, якія даюць адлюстраванне, неабходна закрыць, экраніраваць тканінай белага колеру, які спрадвеку суправаджаў абрад пахавання [14, с. 121-125].

"Жалоба па нябожчыку вытрымліваецца цэлы год", на працягу якога ў сям'і павінны былі прытрымлівацца шэрагу рэгламентацый: "не пішуць крэйдаю крыжоў на Вадохрышча…" [9, с. 292]; "У час жалобы не можна скакаць, спяваць вясёлыя песні…На Вялікдзень не красяць яец у чырвоны колер, а застаўляюць белымі ці красяць на зеляно, бы рунь. Музыкі не павінны ў жалобе йграць" [23, с. 232]. Забаранялася аддаваць рэчы



Полесгу

памёршага; капаць калодзеж; саджаць ці выкарчоўваць пладовыя дрэвы; гарадзіць плот, у адваротным выпадку зямля “адкажа” неўраджаем.

Калі ўсвядоміць, што казка – гэта зашыфраваныя веды нашых продкаў пра іх спрадвечныя традыцыі, то становіцца зразумелым, чаму старыя людзі забаранялі маладым і ўдовым людзям праўляць вяселле на працягу першага памінальнага года: “…Усё гэто робяць, каб нябожчык не абіжаўся да спрыяў сям’і” [23, с. 232]. На працягу гэтага і наступных гадоў агульным днём для наведвання могілак і ўшанавання продкаў будзе толькі субота (выключэнне 3, 9, 40 дзень, *угодкі*, дзень смерці, *Радаўніца, Наўскі Вялікдзень* і некаторыя інш.) [13, с. 147].

Такім жа высокім семіятычным статусам было надзелена нараджэнне дзіцяці, якое станавілася своеасаблівай кропкай адліку новага абрадавага часу ў сям’і, члены якой ўключаліся ў сістэму дзеяння яшчэ аднаго часавага вымярэння, ўводзілі новую, быццам бы паралельную шкалу разгортвання падзей, у якой, захоўваўся той самы рытм часавага парадкавання: 0 – 3 – 9 – 40 – 1 год. У гэтым выпадку адбываецца не што іншае, як праяўленне канвергенцыі (збліжэння) часавых сістэм парадкавання і вымярэння, чаго фактычна не можа быць у выпадку смерці суродзіча.

Па ўяўленнях беларусаў, **момант нараджэння дзіцяці** меў лёсавызначальны характар [2, с. 9-13]. Перш за ўсё ён цесна суадносіўся з шматлікімі фактарамі ўласна касмічнага кшталту. Вось некаторыя прыклады: “хто родзіцца ў зімку…на такіх людзях і свет трымаецца; …улетку, будзе вельмі гарачы да сярдзіты; марцовыя дзеці не бываюць сталымі людзьмі; маёвыя дзеці самыя нешчаслівыя…; ўвосень і верабей піва вараць… – багатае будзе дзіця; калі народзіцца на растучую луну – то добра, таму ніколі не будзе старасці; “панядзелак…хто родзіцца ў гэты дзень, та будзе гультаяватым… Хто родзіцца ў нядзельку, той будзе самы шчаслівы”[23, с. 173-174].

Фактар часавай прымеркаванасці дапаўняўся шэрагам фізіялагічных акалічнасцей. Недаўгавечнасць нованароджанага прадказвала тое, “калі дзіця нараджаецца тварам…ўніз; “калі яно маўчыць і спакойнае”; знак “шчасця” атрымлівала дзіця, якое “раджецца ў чапцы, ці як жэ кажуць, у сарочцы…Кажуць, што такая маччына сарочка перасцерагае ад хваробы, непрыяцеля і дае вялікае шчасце ва ўсю жытку” [23, с. 171-172].

Першыя тры дні ў кантэксце сямейна-родавых абрадаў былі строга рэгламентаваны: вяселле з’яўлялася тым фэстам, калі дзяўчына і хлопец пераходзілі ў іншы стан суіснавання, абрад пахавання быў зарыентаваны на “пераход” чалавека з царства зямнога ў нябеснае. Нараджэнне дзіцяці – той самы “пераход” з чэрава маці да жыцця ў зусім новым свеце [34, с. 188]. У адпаведнасці з традыцыйнымі ўяўленнямі беларусаў, **першыя тры дні** пасля нараджэння дзіцяці былі асабліва важнымі: Бог “*едзець, долечку нясець гэтаму дзіцяці, гэтаму маленькаму. І хлебавую, і грашавую, і тую вянчальную*” [21, с. 21-22]. Таму на працягу трох дзён у сям’і неабходна было падтрымліваць сітуацыю стабільнасці: “Як родзіцца дзіця, першыя тры дні не можна пазычаць людзям нічога з хаты, асабліва агню, бо дзіця як падрасце, та будзе цурацца свае хаты да можэ зрабіцца спрэс валацугаю” [9, с. 111; 23, с. 176]. Тут да месца будзе нагадаць казку *“Аддай мне тое, што ў доме невядома”,* у якой купец за сваё выратаванне аддаў сына (!), пра нараджэнне якога не ведаў [32, с. 273-279]. Адным з доказаў “закрытасці” сям’і на працягу першых трох дзён з’яўляецца забарона прыходзіць у гэты час у адведкі: “Як толькі пройдзе тры дні пасля родаў, сваячкі і суседкі ідуць да “радзіхі ў провідкі” [9, с. 111].

У першыя дні пасля нараджэння, як правіла, **на дзевяты дзень** [25, с. 52]) выконваўся абрад **першага рытуальнага купання дзіцяці** [9, с. 107] **(**першага, таму што пасля смерці будзе выканана апошняе рытуальнае купанне, якое будзе скіравана на тое, каб “змыць” з чалавека сляды яго зямнога існавання [9, с. 261; 18, с. 261]). Яно было з’арыентавана на тое, каб “запраграмаваць” перспектывы яго будучага жыцця. З гэтай мэтай у ваду для купання клалі спецыяльныя прадметы: “…на Палессі звычайна соль і асвячоныя травы, у іншых месцах – сярэбраную манету, каб дзіця вырасла чыстае, як

срэбра, здаровае і багатае;…асвячоную на Іярдане ваду…засцерагчы ў будучым ад злых вачэй” [9, с. 105; 23, с. 172].

Да **саракавога дня** дзіця хрысцілі і давалі імя: “*Храсціць дзіцятка найлепш, як споўніцца 6 нядзель, або да таго, як уводзімся, 40 дзён*” [25, с. 660-663]. На саракавы дзень выконваўся абрад вацэркаўлення (уводзін) маці – умоўнае “вяртанне” ва ўлонне Царквы. Тут мы бачым даволі істотны ўплыў хрысціянскай традыцыі, якая расставіла свае часавыя акцэнты. “Па меры ўмацавання хрысціянства абрады, якія раней адносіліся да дня з’яўлення дзіцяці на свет, былі перанесены на дзень хрышчэння. Дзеянні, якія выконваліся над дзіцем у гэтыя дні, аказвалі ўплыў на яго дзяцінства, юнацтва і нават на ўсё яго жыццё”– сцвярджае П. Багатыроў [3, с. 89-90]. Думаецца, што гаворка ідзе ў першую чаргу пра імя, якое раней давалі ў момант першага купання дзіцяці [16, с. 176]. Па меркаваннях нашых продкаў, пакуль дзіця не пахрысцяць, ён не мае свайго “ахоўніка”, таму яго нельга паказваць чужым людзям, выносіць на вуліцу; у некаторых месцах маці нават забаранялася карміць нехрышчонае дзіця [25, с. 86, с. 664-666]. А.К. Байбурын сцвярджае: “На радзінах сорак дзён – тэрмін, падчас якога маці і дзіця павінны прайсці ўсе этапы іх уключанасці ў свет жывых. На пахаванні за гэты ж тэрмін нябожчык павінен канчаткова перайсці ў свет мёртвых. Цікава, што, па карэльскіх ўяўленнях , у аналагічным стане падчас сарака дзён знаходзіліся жаніх і нявеста на вяселлі” [1, с. 95].

**На працягу першага года жыцця** дзіця станавілася цэнтрам сусвету, вакол якога фарміравалася значная колькасць абмежаванняў і перасцярог. Любая падзея ў жыцці нованароджанага ўспрымалася як ўрачысты акт, які суправаджаўся рытуальнымі дзеяннямі: першы самастойны крок “перарэзваннем путаў”; з’яўленне і выпадзенне першага зуба са “зваротам да мышкі” [15, с. 83-84; 23, с. 183] і інш. На працягу першага года дзіцяці не стрыглі валасы, “каб не застрыгчы мову і памяць” [15, с. 90, 118]; “каб не балелі вочкі”; нельга “…падносіць дзіця к люстэрку ці к вадзе, каб яно не ўбачыла там сябе” [23, с. 183]. Роўна ў год праводзілі абрад першага пастрыгу [17, с. 203], валасы якога клалі за бажніцу і захоўвалі на працягу ўсяго жыцця [12, с. 325-333]; не аддавалі адзенне дзіцяці, яго калыску, ложак; раілі, каб дзіця было ахвотнае да працы, “першую работу” ўкласці ў рукі ў той дзень, у які яно нарадзілася [23, с. 185].

Нашы продкі верылі, што з’яўленне чалавека на свет – гэта вырашэнне Нябёсаў, таму народнае выслоўе зафіксавала асноўныя вехі жыцця чалавека наступным чынам: *“Радзіны, вяселле й смерць, гэто самае важнае ў жыццю чалавека. Радзіны кожны перажыў, а смерць не міне, а вяселле – як Бог судзіць”* [23, с. 197]. **Пахавальны абрад адмяняў** сістэму каляндарных святкаванняў, **радзінны абрад уключаўся** у сістэму каляндарных адносін, **вясельны абрад прыстасоўваўся** да рытмаў каляндарных падзей: дату вяселля трэба было дакладна вызначаць. Абрадавая структура перад-, вясельнага і паслявясельнага перыядаў сведчыць пра тое, што і яна суадносіцца з універсальным рытмам традыцыйнай культуры.

Кропкай адліку вяселля можна было б лічыць дзень сватаўства. У асяроддзі славян найбольш удалымі лічыліся “мужчынскія” дні – **аўторак і чацвер**, у назвах якіх зашыфравана парнасць (другі і чацвёрты), што з’яўляецца сімвалічнай дамінантай ў змесце найбольшай колькасці вясельных абрадаў [9, с. 189]; “Якраз у гэтую пару (паміж Пакровамі і першай нядзеляй Піліпаўскага посту – удакладненне А.К.) дзяўчаты, якія думаюць аб сваёй долі, бываюць асабліва рухавыя і неспакойныя: апрача таго, што яны больш старанна, чым у іншы час, уходжваюцца каля дому, мусяць асаблівую ўвагу звяртаць на чысціню і ахайнасць; асабліва яны стараюцца **ў чацвер і суботу,** дні, у якія звычайна прыязджае сват” (Барысаўскі, Полацкі раёны) [7, с. 39; 522]. Услед за днём сватаўства прызначалі *праведкі*, *пярэпыты*, *змовіны*, *запоіны* і іншыя сустрэчы двух бакоў.

Вырашальным днём перадвясельнага перыяду была *зборная субота* (завівалі вянок, пастрыгалі жаніха і нявесту, садзілі маладых на пасад): *“Зборная суботка настала, // Марыська дзевачак збірала…”*. Асноўным свяшчэннадзействам гэтага часу было выпяканне караваю – сімвала сямейнага шчасця: *“Ляцелі птушачкі з раю, //*

*Пыталіся ў караваю: //–Ці ўжо каравай учынялі, Чаму нас, птушачак, не ждалі? //Мы б таму часу прыбылі, // Шчасце-долю прынеслі, // Шчасліўую гадзіну // Нашаму сужаньку-чалядзіну"*; "*Караваю, мой раю, // Вяселле пачынаю. // З шчасцею і з доляю, // Шчаслівай гадзінаю. // Шчаслівай гадзінаю, // З вялікай дружынаю* [7, с. 61, 68-69, 192]. Каравай выпякалі напярэдадні вяселля, звычайна, у суботу, у Пружанскім раёне у дзень вянчання – у нядзелю [7, с. 132]; у Ваўкавыскім, Лепельскім раёнах у чацвер: "Калі ў той дзень, як пякуць каравай, да не будзе відаць сонейка, то й жытка маладых будзе нярадасная, а калі ясна засвеціць сонейка, то й жытка будзе ясная, радасная"; у пахмурны дзень "каб жыццё маладых не было цяжко, пасупно", чакалі, каб на хвілінку выглянула сонейка, і тады пачыналі мясіць каравай [9, с. 221].

Абавязковая ўмова прызначэння дня для выканання таго ці іншага вясельнага абраду "абмінуць" дзень смерці і нараджэння: не ішлі сватацца ў той дзень тыдня, у які памёр нехта са сваякоў дзяўчыны, "бо з таго не будзе ладу, а калі й будзе, та жытка маладых будзе недаўгавечная й нешчаслівая" [23, с. 198]; "...калі хтосьці з маладых прыйшоў у чацвер на свет, звычай патрабуе рашчыняць каравай на дзень раней, г. зн. у сераду (радзей у пятніцу), пра што заўсёды памятаюць" [7, с. 128; 9, с. 221].

Само вяселле звычайна доўжылася **тры дні**: *"Прапіла маці дочку // На салодкім мядочку. // Не за год згадавала, //А за тры дні прагуляла"*; "Вяселле пачыналася са збора дружыны, звычайна ў суботу, а яшчэ даўней – у нядзелю, і доўжылася два-тры дні"; "Вяселле ў нас адбываецца дзён чатыры-п'яць. Больш усяго пачынаючы з п'ятніцы да аж да серады на другом тыдні"; "Вяселле, бывала, начынаецца ў нядзелю, а потым панядзелак і аўтарак гуляюць, значыцца тры дні" [7, с. 89; 23, с. 203].

У нядзелю наступнага тыдня (прыблізна **на дзевяты дзень** пасля вяселля) ў хаце маладой спраўлялі *пярэзвы (пірагі, пірязоў, перазыўкі, прыгасці)*: "бацькі маладога едуць да бацькоў маладой і святкуюць "сваё" вяселле" [13, с. 149]. Сімвалічным быў гэты дзень і для нявесты: з гэтага моманту пачыналася яе новае жыццё ў сям'і мужа і далей прыходзіць у бацькоўскую хату яна зможа толькі ў спецыяльна вызначаныя для гэтага дні. Салановіч Марыя Іванаўна, 1934 г.н. з вёску Любонічы, што на Магілёўшчыне, тлумачыла: "*Маці ўзяла бохан хлеба, адрезала акраец і кажа: – Ну, вось гладзі, дачушачка, ужо ніяк абратна не прыляплю. Адрэзана!*". А на працягу цэлага тыдня пасля вяселля "куды б яна ні пашла", павінна была насіць з сабой кавалачак хлеба, "каб усім угадзіць, каб яны спрыялі да не рабілі ліха" [9, с. 226; 23, с. 203;].

**Роўна месяц** (пачынаючы ад *пярэзваў*) доўжыўся той тэрмін, які ў народзе назвалі *мядовым*. **На працягу першага вясельнага года** ў маладой сям'і з'яўляўся прадаўжальнік роду – першае дзіця. Развіццё эмбрыёна чалавека таксама доўжыцца дзевяць месяцаў або сорак тыдняў.

Лічбы, якія пакладзены ў аснову універсальнага рытму, шмат у чым прадвызначаюць некаторыя аспекты традыцыйнага гаспадарання. Цяля да каровы падпускалі толькі пасля трэцяга удою, пасля дзевятага можна было варыць малодзіва, пасля саракавога – дазвалялася піць сырадой [13, с. 149-150].

Наступленне смерці чалавека прадказвала шэраг з'яў і акалічнасцей, момант нараджэння чалавека распавядаў пра яго лёс, характар, здольнасці і магчымасці. Таму часу, калі наступала вяселле, таксама былі перадумовы. Па-першае – варожбы на *Каляды*, *Купале* і інш. святы, па-другое – рытуальна-абрадавыя дзеянні сацыяльнага характару (на *Каляды* выкананне абраду *Жаніцьба Цярэшкі*, на *Тройцу* – кумленне і інш.). Па-трэцяе – выкананне / невыкананне рэгламентацый і забаронаў, якія маглі ўплываць на лёс дзяўчыны або хлопца. Ва ўсе часы бясшлюбнасць лічылася вялікім сорамам як для нежанатай моладзі, так і для іх бацькоў. Адсюль столькі абрадавых (напрыклад, навязванне калодак на Масленіцу) і пазаабрадавых дзеянняў (кпінаў, праклёнаў, брыдкіх слоў) з боку сялянскай абшчыны да нежанатай моладзі. Пад страхам не выйсці замуж – ажаніцца і стварыць сям'ю забаранялася: сядзець на парозе тварам на двор; сядзець на калодцы, на якой дровы сякуць, "пакуль калодка не рассыплецца, патуль той не будзе пары"; месці хату, займацца ткацтвам па пятніцах і святочных днях і інш. [23, с. 194; 24,



Полесгу

с. 147]. Людзей, якія не ўступілі ў шлюб, не прадоўжылі свой род, ізалявалі ад выканання абрадавых дзеянняў як каляндарнай цыклу, так і сямейна-родавай накіраванасці: “…іх не пасылаюць сватаць, не клічуць выпякаць вясельны каравай і інш.” [24, с. 147-148].

Аналіз шматлікіх казачных сюжэтаў, народных замоў дае падставы сцвярджаць, што ў аснове універсальнага рытма ляжаць усё тыя ж космапланетарныя дэтэрмінанты. Казачнае *тры-дзевятае* царства ёсць не што іншае, як поўны цыкл фазаў Месяца (3х9=27), а ўвядзенне сакральных лікаў дзевяць і сорак у структуру аналізуемага універсуму адпавядае цыклічнасці Сонца (9х40=360). Магчыма якраз таму суаднесенасць цыклаў двух касмічных свяціл была пакладзена ў аснову алгарытму вызначэння даты святкавання Вялікадня (першая нядзеля пасля першай Поўні, якая наступае пасля дня веснавога раўнадзенства), святкавання Радаўніцы (дзевяты дзень пасля Вялікадня) і Узнясення (саракавы дзень пасля Вялікадня).

Такім чынам, даследаванне корпуса архаічных тэкстаў беларускага фальклору (перш за ўсё чарадзейных казак) дазволіла раскрыць складаны, шматузроўневы характар ўзаемаспалучэння лінейнага вектару часу ў сямейна-родавых абрадах і закальцаванасць часу ў традыцыйным календары. Пахавальна-памінальны кантэкст лінейнага часу адмяняў дзейнасць каляндарнага часу для сям’і памёршага. Рытуальна-абрадавы комплекс вяселля, наадварот, строга падпарадкоўваўся нарматыўна-рэгламентуючай базе звычаёвага права традыцыйнага календара, а радзінна-хрэсьбінны комплекс адпаведна напластоўваўся на падзеі апошняга. У сувязі с тым, што лінейны вектар парадкавання часу (0 – 3 – 9 – 40 – 1 год) парадкуе архітэктоніку некалькіх абрадавых комплексаў, мы палічылі магчымым назваць яго універсальным.


1. Байбурин, А.К. Ритуал в традиционной культуре / А.К. Байбурин. – СПб. : Наука, 1993. – 240 с.
2. Баранов, Д.А. Родинный обряд : время, пространство, движение / Д.А. Баранов // Родины, дети, повитухи в традициях народной культуры / сост. Е. А. Белоусова; отв. ред. С. Ю. Неклюд. – М. : Российск. Гос. Гуманит. Ун-т, 2001. – С. 9-30.
3. Богатырёв, П.Г. Народная культура славян / П.Г. Богатырёв; сост. Е.С. Новик, Б.С. Долгин; ред. Е.С. Новик. – М : ОГИ, 2007. – 368 С.
4. Бонецкая, Н.К. Бахтин Михаил Михайлович / Н. К. Бонецкая // Культурология. XX век. Энциклопедия. Т.1. – СПб. : Университетская книга; ООО Алетейя, 1998. – С. 52-54.
5. Булгаковский, Д.Г. Пинчуки : Этнографический сборник (песни, загадки, пословицы, образы, приметы...) / Д.Г. Булгаковский. – Записки ИРГО по отделению этнографии. Т. XIII, вып. 3. – СПб. : Тип. В. Безбородова и комп., 1890. – 200 с.
6. Выслоўі / Склад., сістэм. тэкст., уступ. арт. і камент. М. Я. Грынблата. – Мінск : Навука і тэхніка, 1979. – 520 с.
7. Вяселле: Абрад / уклад., уступ. арт. і камент. К.А. Цвіркі. – Мінск : Навука і тэхніка, 1978. – 640 с.
8. Гуц, А.К. Элементы теории времени / А.К. Гуц. – Омск : Изд-во Наследие. Диалог-Сибирь, 2004. – 364 с.
9. Жыцця адвечны лад : беларускія народныя прыкметы і павер’і / уклад., прадм. і пер. У. Васілевіч. – Кн. 2. – Мінск : Маст. літ., 1998. – 607с.
10. Косарев, М.Ф. Основы языческого миропонимания: По сибирским археолого-этнографическим материалам / М.Ф. Косарев. – М. : Ладога-100, 2000. – 352 с.
11. Котович, О.В. Золотые правила народной культуры : научн.-популяр. изд. / О. Котович, Я. Крук. – Минск : Адукацыя і выхаванне, 2007. – 584 с.
12. Крук, Я. Колесо времени : традиции и современность / Я. Крук, О. Котович. – 3-е изд., испр. и доп. – Минск : Беларусь, 2010. – 350 с.
13. Крук, Я. Сімволіка беларускай народнай культуры / І. І. Крук. – 2-е выд. – Мінск : Ураджай, 2001. – 350 с.
14. Кутенков, П.И. Великорусская женская сряда (одежда). Сядемская и вяземская крестьянские родовые культуры (середина 19 – начало 20-го в.). – Кн. 1. Ч. 1 : СПб.; Пенза, 2009. – 176 с.
15. Кухаронак, Т.І. Радзінныя звычаі і абрады беларусаў: Канец XIX–XX ст. / Т. І. Кухаронак. – Мінск : Навука і тэхніка, 1993. – 126 с.

16. Народная духоўная спадчына Гомельскага раёна / уклад.сістэм., тэкст. праца і рэд. В. С. Новак. – Гомель : ААТ Полеспечать, 2007. – 456 с.
17. Нидерле, Л. Славянские древности / Л. Нидэрле. Пер. с чешск. Т. Ковалевой, М. Хазанова, ред. А. Л. Монгайта. – 2-е изд. – М. : Алетейа, 2001. – 592 с.
18. Никифоровский, Н.Я. Простонародные приметы и поверья, суеверные обряды, легендарные сказания о лицах и местах Витебской Белоруссии / Н.Я. Никифоровский. – Витебск : Губерн. Типо-Литограф., 1897. – 307 с.
19. Полацкі этнаграфічны зборнік. Вып. 1. Народная медыцына беларусаў Падзвіння. У 2 ч. – Ч.2 / склад. А.У. Лобач, У.С. Філіпенка. – Наваполацк : ПДУ, 2006. – 332 с.
20. Пропп, В.Я. Исторические корни волшебной сказки / П.Я. Пропп. – М. : Изд-во Ленинград. гос. ордена Ленина ун-та, 1946. – 340 с.
21. Радзіны: Абрад. Песні / уклад. і сістэм. тэкстаў Г.А. Пятроўскай, апісанне абрадаў Т.І. Кухаронак, уступ. арт. і камент. Г. А. Пятроўскай, Г. В. Таўлай, Т. І. Кухаронак; рэдкал: А.С. Фядосік [і інш.]. – Мінск : Беларус. навука, 1998. – 637 с.
22. Сержпутоўскі, А.К. Казкі і апавяданні беларусаў-палешукоў / А.К. Сержпутоўскі. – Мінск : Універсітэцкае, 1999. – 191 с.
23. Сержпутоўскі, А.К. Прымхі і забабоны беларусаў-палешукоў / А.К. Сержпутоўскі. – Мінск : Універсітэцкае, 1998. – 301 с.
24. Славянские древности : Этнолингвистический словарь в 5-ти томах / под общей ред. Н. И. Толстого. – Т. 1: А – Г. – М. : Междун. отношения, 1995. – 584 с.
25. Славянские древности : Этнолингвистический словарь в 5-ти томах / под общей ред. Н. И. Толстого. – Т. 2: Д-К (Крошки). – М. : Междун. отношения, 1999. – 704 с.
26. Славянские древности: Этнолингвистический словарь в 5-ти томах / под общей ред. Н.И. Толстого. – Т. 3: К (Круг) – П (Перепелка). – М. : Междун. отношения, 2004. – 704 с.
27. Славянские древности: Этнолингвистический словарь в 5-ти томах. / под общей ред. Н.И. Толстого. – Т. 4: П (Переправа через дорогу) – С (Сито). – М. : Междун. отношения, 2009. – 656 с.
28. Соболев, А.Н. Мифология славян. Загробный мир по древнерусским представлениям / А. Н. Соболев. – СПб. : Лань, 1999. – 272 с.
29. Соколова, В.К. Весенне-летние календарные обряды русских, украинцев и белорусов / В.К. Соколова.– М. : Наука, 1979. – 290 с.
30. Фядосік, А.С. Адметнасці пахавальнай і памінальнай абраднасці беларусаў / А. С. Фядосік // Сямейна–абрадавая паэзія. Народны тэатр / А. С. Фядосік [і інш.], рэд. К. П. Кабашнікаў. – Мінск : Беларус. навука, 2001. – С. 346- 271.
31. Хайдеггер, М. Время и бытие: Статьи и выступления / М. Хайдеггер. Пер. с нем. – М.: Республика, 1993. – 447 с.
32. Чарадзейныя казкі / рэд. В.К. Бандарчык. – Ч. І. – Мінск : Навука і тэхніка, 1973. – 648 с.
33. Чарадзейныя казкі / рэд. В.К. Бандарчык. – Ч. ІІ. – Мінск : Навука і тэхніка, 1978. – 696 с.
34. Шамякіна, Т.І. Міфалогія Беларусі (нарысы) / Т.І. Шамякіна. – Мінск : Маст. літ., 2000. – 400 с.

ПолесГУ